## Праз пяцьдзесят гадоў

14 студзеня 1994 г. Мазыр святкаваў 50-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цёпла, сардэчна, са слязьмі на вачах прымалі мазыране сваіх вызваліцеляў. З Валгаграда прыехаў кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў, былы гвардзеец 14-й кавалерыйскай дывізіі А. І. Васкоўскі. Ён прывёз свяшчэнную зямлю горада-героя на Волзе, пасведчанні, значкі, кнігі. Р. І. Папушын прыбыў з Краснаярскага краю, палкоўнік Я. М. Пакроўскі — з Севастопаля, І. Б. Хамякоў — былы начштаба 1323-га палка — з Масквы, Герой Савецкага Саюза П. М. Маштакоў — з Уладзіміра. Сярод ганаровых гасцей — П. П. Собалеў — старшыня Савета ветэранаў 6-й артылерыйскай дывізіі прарыву рэзерву Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, былы камандзір вучэбнай роты 55-й стралковай дывізіі В. І. Турчанінаў. Прыехалі зенітчыцы 546-га палка Т. А. Панфілава з Караганды, М. С. Рахматуліна, М. В. Шміт з Томска, былы камсорг палка Р. А. Сямёнаў з Мінска. Сярод прадстаўнікоў 157-га Брэсцкага Чырванасцяжнага знішчальнага авіяпалка сакратар Савета ветэранаў І. М. Цімафеенка, М. М. Барбарыч і іншыя. Прыбыў на свята былы сакратар Палескага падпольнага абкама камсамола У. Г. Козыр.

«Нас усё менш і менш...» — гэтыя словы з песні «Жывая памяць» часта гучалі ў гэты незабыўны дзень. Час ідзе, але не меркне слава герояў XX стагоддзя, пераможцаў у самай страшнай і крывавай вайне. Ветэраны павезлі з сабой часцінку сардэчнай цеплыні ўдзячных мазыран, якія змаглі захаваць і зберагчы ўсё, што звязана з вялікай Перамогай. Ніштто не забыта, ніхто не забыты...

*Т. Пілiпчук*



Ускладанне вянкоў да брацкай магілы воінаў, якія загінулі за вызваленне Мазыра ў студзені 1944 г.